*ВЯЧАСЛАЎ КАЛАЦЭЙ*
*(г. Мінск)*

# Мець уласнае меркаванне
## (да юбілею Мікалая Рыгоравіча Дудчанкі)

Творчы працэс і ўпісванне яго ў рэчаіснасць — змясціты шлях шматлікіх кампрамісаў, а прыклады вядомых «гутаперчавых» артыстаў, якія ўсім да спадобы і з усім заўсёды згодны — сёння не рэдкасць. Творчыя асобы, якія не толькі маюць уласнае меркаванне, але заўсёды паслядоўна яго бароняць, прычым, не выключна з упартасці, а праз намер удасканаліць чалавека і наваколле — з'ява рэдкая. Менавіта пра гэта прымусіла задумацца 70-годдзе харэографа, педагога, рэжысёра, сцэнарыста, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі (1999) Мікалая Рыгоравіча Дудчанкі — асобы, на мой погляд, чый жыццёвы і творчы шлях — прыклад адданасці аднойчы прынятым ідэалам эстэтыкі сапраўднага каранёвага мастацтва, уласнаму прынцыповаму меркаванню, нават калі яно разыходзіцца з агульнапрынятым, няспыннай працай над сабою і адкрытасці новаму і нязвыкламу ў творчасці.

Чалавек, які мае ўласны погляд на ўсё: ад лексікі народнага танца і гісторыі фіна-ўгорскага касцюма да геапалітыкі, аналізу акалічнасцей Другой Сусветнай вайны і семіятычных і лінгвістычных параўнанняў у тапаніміцы і геральдыцы — у асяроддзі натхнёнай творчай інтэлігенцыі заўсёды выглядае трошкі залішне энцыклапедычна адукаваным. Але моцная харызма, тактоўнасць, арганізацыйны талент і практычны досвед спадара Мікалая заўсёды здымае бар'ер паміж ім і танцорамі, музыкамі, спевакамі, кіраўнікамі творчых калектываў, якія бясспрэчна прызнаюць яго аўтарытэт, заслужана паважаюць і цэняць вынікі сумеснай працы.

У біяграфіі Дудчанкі творчых перамог і дасягненняў было багата (я б нават ужыў выраз «нерэальна багата»). Усе яго наватворы мелі моцны мастацкі і грамадскі рэзананс: ці гэта дзейнасць харэаграфічнага ансамбля танца «Вяснянка» ў Магілёве (з 1966 г.); ці громкі міжнародны трыумф створанага сумесна з Валянцінай Гаявой ансамбля «Харошкі» (з 1974 г. калектыў паспяхова гастраляваў [2]; ці паспяховая living рознабаковая дзейнасць яго ансамбля «Бліскавіца» (з 1993 г.); ці рэжысура Першага рэспубліканскага фестывалю беларускага народнага танца (Гродна, 1990) і Другога міжнароднага фестывалю харэаграфічнага мастацтва «Сожскі карагод» (Гомель, 1999); ці аўтарства сцэнарыяў і пастаноўка юбілейных мерапрыемстваў і тэатралізаваных свят (усесаюзных, рэспубліканскіх, абласных) у Мінску, Брэсце, Гродна (1986—1996); ці балетмайстарска-пастановачная праца ў оперы «Дзікае паляванне караля Стаха» У. Солтана (1989); ці аўтарства больш за 100 арыгінальных харэаграфічных мініяцюр, кампазіцый, танцаў, у тым ліку створаных на беларускім харэаграфічным фальклоры: «Крутуха» (1969), «Весялуха» (1970, разам з В. І. Гаявой), «Крыжачок» (1972), «Таўкачыкі» (1993), «Субота» (1974, разам з В. І. Гаявой), «Мазур-полька», «Саўка» (абодва 1994), «Падэспань» і «Танец з Траецкага прадмесця» (абодва

1995); ці выкладанне народнага танца ў Магілёўскім культасветвучылішчы (1968—70) і ў Мінскім харэаграфічным вучылішчы (1978—82), дзе ён выкарыстоўваў аўтарскія методыкі па харэаграфіі, у тым ліку добра вядомую спецыялістам «Методыку сцэнічнай апрацоўкі беларускага танцавальнага фальклору»; ці выкладанне рэжысуры ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў (2005—2012). Сёння сапраўды цяжка ўявіць, што ўсё гэта, як і шмат чаго яшчэ, зроблена адной асобай.

Як даследчык і аналітык харэаграфіі, балетмайстар-наватар Мікалай Дудчанка — прызнаная ў мастацкіх колах велічыня, і, як адзначаюць калегі: «яго пастаноўкі, прысвечаныя нацыянальнай тэматыцы, вылучаюцца самабытнай пластыкай, арыгінальнай кампазіцыяй» [1, *449*], да таго ж, у іх надзвычай арганічная дынамічная сувязь паміж музыкай, пластыкай і рэжысурай. Гэта не дзіўна, бо менавіта рознабакова і якасна адукаваны Мікалай Дудчанка (выпускнік Чалябінскага музычнага вучылішча /1961/ і Вышэйшай прафсаюзнай школы Усесаюзнага цэнтральнага савета прафесійных саюзаў у Ленінградзе /1966/) адзін з першых звярнуў увагу на разнастайную рэгіянальную і лакальную адметнасць беларускага танца, неаднаразова і паслядоўна здолеў увасобіць яе ў сцэнічных формах мастацтва, чым моцна і пераканаўча ўзбагаціў лексіку айчыннай народна-сцэнічнай харэаграфіі.

Прынцыповасць і непахіснасць Дудчанкі-кіраўніка і Дудчанкі-грамадскага дзеяча не раз праяўлялася ў складаных сітуацыях, якімі багата культурнае жыццё Беларусі. Ён метадычна і грунтоўна дапамагаў: станаўленню і міжнародным сувязям дзіцячага ансамбля Т. Быстровай «Дзіця свету»; запатрабаваным грамадскасцю творчым праектам міжнароднага ўзроўню дырэктара Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі (г. Мінск) і рэдактара часопіса «Абарона і справядлівасць» А. Дзмітрыевай; станаўленню і выхаду на сусветнапрызнаны ўзровень фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (былая Рудабелка, зараз — мястэчка Акцябрскі Гомельскай вобласці), які спраектаваў і курыруе вучань і саратнік этнахарэолаг М. Козенка. Парадамі Дудчанкі карысталіся ўдзельнікі постфальклорных калектываў дударскай і смыкавай музыкі і этнічных спеваў «Ветах» і «Верас» (г. Мінск); шмат у чым дзякуючы яго падтрымцы піянер танцавальнага фальклорнага руху на Беларусі — мётчанскі гурт «Берагіня» (Барысаўскі р-н Мінскай вобл.) — стаў заслужаным аматарскім калектывам Рэспублікі Беларусь; а кафедра этналогіі і фальклору БДУКМ захавала свой культурна-антрапалагічны напрамак як практычная фалькларыстыка. Людзі, якія робяць плённую працу на карысць беларускай этнічнай культуры, народнага мастацтва, — заўсёды знаходзілі ў Мікалая Рыгоравіча параду, падтрымку і дапамогу.

Як бачым, вернасць аднойчы прынятым ідэалам эстэтыкі народнага мастацтва, уласнаму прынцыповаму меркаванню (нават калі яно разыходзіцца з агульнапрынятым), няспынная праца над сабою, адкрытасць новаму і эксперыментальнаму дазволіла Мікалаю Дудчанку зрабіць надзвычай важкі ўнёсак у айчыннае мастацтва мяжы XX — XXI стагоддзяў, спрыяць уласным прыкладам і добразычлівымі парадамі развіццю яго перспектыўных і інавацыйных форм, заснаваных на этнічнай культуры беларусаў.

*2013, верасень*

*Літаратура*

1. Козенка, М. Дудчанка Мікалай Рыгоравіч / М. Козенка // Беларускі фальклор : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал. : Г. П. Пашкоў [і інш.] — Т. 1 : Акапэлла — Куцця. — Мінск : БелЭн, 2005. — С. 449.

2. Харошкі [Электроны рэсурс]. — Рэжым доступу : http://be.wikipedia.org/wiki/Харошкі. — Дата доступу: 10.09.2013.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ